Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
___________________Ю.П.Бондар
«____» ____________ 20____г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# БЕЛАРУСКІ ФАЛЬКЛОР

*Праграма дзяржаўнага экзамена*

*па спецыяльнасці* 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках)
напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)

Мінск 2011

**Складальнік:**

*Гулак А.А.,* старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

Кафедрай этналогіі і фальклору Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»
(пратакол № 8 ад 17.03. 2011г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У сучасных умовах глабалізацыі і пагрозы культурнай разнастайнасці студэнты павінны добра разумець і быць перакананымі ў неабходнасці вывучэння, захавання, папулярызацыі і трансляцыі культурнай спадчыны беларускага народу ва ўсіх яе формах.

Праграма дзяржаўнага экзамена «Беларускі фальклор» распрацавана для студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю па спецыяльнасці 1-18 01 01 «Народная творчасць».

Дзяржаўны экзамен «Беларускі фальклор» з'яўляецца тэарэтычным і практычным падсумаваннем ведаў і навыкаў, набытых і засвоеных студэнтамі за гады навучання па напрамку «фальклор» спецыяльнасці «Народная творчасць». Ён праводзіцца ў вуснай форме (адказ па білету) у прысутнасці Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі. Вынікі экзамена абвяшчаюцца старшынёй камісіі пасля закрытага абмеркавання.

**Мэта дзяржаўнага экзамена** – вызначэнне ўзроўню падрыхтоўкі студэнтаў у галіне беларускага фальклору і гісторыі беларускай фалькларыстыкі.

**Задачы** – вызначэнне ўзроўню засваення сучасных тэарэтычных дасягненняў айчыннай фалькларыстыкі, уменне рэалізоўваць міжпрадметныя сувязі; выяўленне здольнасці да самаадукацыі і трансляцыі ведаў пра фальклор у сучаснае культурнае асяроддзе.

**Студэнт на дзяржаўным экзамене павінен ведаць:**

- нацыянальную адметнасць і месца беларускай народнай культуры сярод іншых славянскіх і еўрапейскіх культур; асноўныя абрадавыя комплексы беларускага фальклору: міфалагічны сэнс, функцыянальнасць, прасторава-часавую прымеркаванасць і тэматычную разнастайнасць пазаабрадавага славеснага і песеннага фальклору;
- сацыяльныя і гісторыка-культурныя перадумовы ўзнікнення навукі аб фальклоры, ролю пэўных дзеячаў, навуковых і грамадскіх устаноў у яе фарміраванні, заснавальнікаў навукі аб фальклоры, вядучых даследчыкаў фальклору і іх працы, асноўныя кірункі збірання, публікацыі і вывучэння вусна-паэтычнай творчасці;
- агульнатэарэтычныя пытанні фалькларыстыкі, этапы яе развіцця, асноўных прадстаўнікоў і іх працы, асаблівасці тэарэтычнага асэнсавання фальклору на розных этапах развіцця навукі і сучасныя праблемы фалькларыстыкі.

**Студэнт на дзяржаўным экзамене павінен умець:**

- аналізаваць фальклорную з'яву паводле жанравай і абрадавай прыналежнасці, выяўляць сувязь пэўнай фальклорнай з'явы з іншымі часткамі духоўнай і матэрыяльнай культуры;
- выяўляць рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці фальклорных і фальклорна-этнаграфічных з'яў традыцыйнай народнай культуры;
- характарызаваць значэнне дзейнасці асобных навукоўцаў і дзеячоў, навуковых і грамадскіх устаноў у фарміраванні навукі аб фальклоры, асноўныя кірункі збірання, публікацыі і вывучэння вусна-паэтычнай творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РАЗДЗЕЛ I
## БЕЛАРУСКІ ФАЛЬКЛОР
### Тэма 1
### Фальклор як нацыянальны здабытак

Пытанні тэрміналогіі: фальклор, вусна-паэтычная творчасць, народная паэтычная творчасць, традыцыйная духоўная культура, мастацтва вуснай традыцыі. Фальклор як вытокавая, каранёвая з'ява народнай культуры. Адлюстраванне ў фальклоры архаічных вераванняў і культаў. Адлюстраванне ў фальклоры працоўнага і сацыяльнага вопыту, народнай этыкі, маралі. Класіфікацыі фальклору: па абрадавай, жанравай, сацыяльнай, узроставай прыналежнасці.

### Тэма 2
### Фальклор: спецыфічныя рысы, поліфункцыянальнасць, сінкрэтызм

Спецыфічныя рысы фальклору – універсальныя ўласцівасці фальклорнай творчасці: сінкрэтызм як непаздзельнасць структурных кампанентаў народнай мастацкай творчасці: слова, музыкі, танца і пантамімы ў традыцыйных відах фальклору; калектыўнасць творчага працэсу як дыялектычнае адзінства індывідуальнай і масавай творчасці; традыцыйнасць як устойлівасць і паўтаральнасць усіх асаблівасцей і кампанентаў фальклорнага твора; варыятыўнасць як спосаб развіцця і міжпакаленнай пераемнасці існавання народнай творчасці шляхам вар'іравання сюжэтных тэм, матываў, вобразаў, паэтычных сродкаў; вуснасць як адсутнасць матэрыяльнай замацаванасці, фіксаваных форм перадачы фальклорных твораў. Поліфункцыянальнасць фальклору: сакральна-магічная, абрадавая, рэлігійная, цырыманіяльная, пазнаваўчая, выхаваўчая, эстэтычная, геданічная функцыі фальклору.

### Тэма 3
### Каляндарна-абрадавы фальклор: архаічная аснова абрадаў і сімволіка абрадавай паэзіі

Генезіс каляндарных абрадаў і каляндарнай паэзіі. Каляндарныя абрады як складаны сакральна-магічны комплекс, у які ўваходзяць славесныя, песенныя, гульнявыя, драматычныя і харэаграфічныя жанры. Спецыфіка міфа-паэтычнага асваення рэчаіснасці ў каляндарна-абрадавай паэзіі. Фалькларызацыя хрысціянскіх свят. ―Народнае праваслаўе". Каляндарныя абрады. Песні земляробчага календара паводле жанравай прыроды: заклінальныя, велічальныя, жартоўныя, лірычныя. Увасабленне гаспадарчага і метэаралагічнага вопыту народа ў павер'ях, прыказках і прыкметах. Гульні і варожбы земляробчага календара.

### Тэма 4
### Сямейна-абрадавы фальклор: сінкрэтызм паэзіі, асаблівасці мастацкіх вобразаў

Генезіс сямейных абрадаў і звязанай з імі паэзіі. Сямейна-абрадавы фальклор як крыніца вывучэння сістэмы сямейных і сацыяльных адносін, народнага побыту і маралі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сямейныя абрады як складаны сакральна-магічны комплекс, у склад якога ўваходзяць славесныя, песенныя, гульнявыя і харэаграфічныя жанры. Жанравае багацце сямейна-абрадавых песень: заклінальныя, велічальныя, жартоўныя, прыпеўкі ды інш. Матывы, вобразы і паэтычныя сродкі. Славесныя і драматызаваныя жанры: заклінанні, прыгаворы, зычэнні, сцэнкі, гульні. Захаванасць сямейна-абрадавага фальклору ў сучасным жыцці грамадства.

**Тэма 5**

**Пазаабрадавая лірыка:**

**балады, песні пра каханне, жартоўныя песні, прыпеўкі**

Песня – універсальны лірычны жанр фальклору. Падзел народнай песеннай лірыкі паводле тэматычнага прынцыпу: лірыка кахання, сямейная, жартоўная, сацыяльна-бытавая. Балады: сямейна-бытавы хартак канфлікту. Песні пра каханне: лірызм і паэтызацыя пачуцця. Жартоўныя песні: мастацкія прыёмы стварэння камічнага. Гістарызм сацыяльна-бытавой лірыкі. Прыпеўкі: жанравыя асаблівасці, сувязь з музыкай, танцам. Песні казацкія, чумацкія, антыпрыгонніцкія, бурлацкія, батрацкія, прымацкія, рэкруцкія і салдацкія песні.

**Тэма 6**

**Замовы**

Унікальнасць і архаічнасць жанру замоў. Анімістычная аснова і ўтылітарна-магічная прырода замоў. Носьбіты замоў і асаблівасці бытавання. Знахарства і чарадзейства. Хрысціянская сімволіка ў замовах. Замовы паводле тэматычнага прынцыпа: гаспадарчыя, ахоўныя, лекавыя, замовы, звязаныя з сацыяльным і сямейным бытам. Кампазіцыя замоў. Паэтыка замоў. Існаванне замоў у сучасным жыцці.

**Тэма 7**

**Малыя жанры фальклору:**

**прыказкі, прымаўкі, загадкі**

Віды народнай афарыстыкі: прыказкі, прымаўкі, прыкметы, павер'і, выслоўі. Пытанні тэрміналогіі і размежавання жанраў. Сінанімія і антанімія малых жанраў фальклору. Праблема літаратурнага перакладу.

Прыказкі як увасабленне народнай мудрасці, жыццёвага вопыту і маральна-этычных норм. Тэматычнае багацце прыказак. Класіфікацыя. Афарыстычнасць народнай мовы ў прымаўках. Граматычныя віды прымавак. Выкарыстанне малых жанраў беларускага фальклору як сродак красамоўства.

Паходжанне жанру загадак. Класіфікацыя. Тэматычнае багацце. Адлюстраванне ў загадках працоўнага быту селяніна. Загадкі ў структуры іншых жанраў фальклору.

**Тэма 8**

**Празаічныя жанры фальклору:**

**казкі, легенды, паданні**

Казкавая проза: казкі пра жывёл, чарадзейныя, бытавыя (уласна бытавыя, сацыяльна-бытавыя і навелістычныя). Жанравыя асаблівасці легендарных казак, казак-небыліц. Няказкавая проза: легенды, паданні, сказы, прымхліцы. Інфарматыўная функцыя як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вызначальны фактар няказкавай прозы. Легенды этыялагічныя (касмаганічныя, зааганічныя), духоўна-этычныя, гісторыка-культурныя, дэманалагічныя. Светапоглядны дуалізм легенд. Паданні гістарычныя, тапанімічныя, паданні пра скарбы, міфалагічныя паданні. Сюжэты беларускіх легенд і паданняў у літаратуры.

## РАЗДЗЕЛ II
## ГІСТОРЫЯ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ

### Тэма 9
### Помнікі старажытнай літаратуры як крыніца фалькларыстычнага вывучэння

Першыя звесткі пра славянскі фальклор у летапісах і старажытнай літаратуры. Народная творчасць у свецкай літаратуры эпохі Адраджэння. Фальклорная паэтыка паэмы ―Песня пра зубра" М. Гусоўскага (16 ст.). Фальклорная вобразнасць у прадмовах Ф. Скарыны (15-16 ст.). Народная парэміялогія і фальклорная паэтыка ў помніках гістарычна-мемуарнай літаратуры. Праца Я. Ласіцкага «Пра рэлігію, ахвярапрынашэнні, вясельныя і пахавальныя абрады русінаў, маскавітаў і татар» (1582). Уплыў беларускай вусна-паэтычнай творчасці на спадчыну С. Полацкага. С. Рысінскі – першы даследчык беларускай парэміялогіі.

### Тэма 10
### Перадумовы ўзнікнення фалькларыстычнай навукі

Узнікненне ў канцы 18 ст. у Рэчы Паспалітай навуковай цікавасці да народнай культуры. Першыя даследчыкі на Беларусі 18 ст., якія спрабавалі асэнсаваць гістарычнае развіццё беларускага краю і культуры беларусаў: А. Нарушэвіч, Ю. Нямцэвіч, Я. Патоцкі, С. Богуш-Сестранцэвіч, Г. Калантай. Дзейнасць Варшаўскага таварыства сяброў навук – першай Акадэміі навук Польшчы. Віленскі ўніверсітэт – старэйшая навучальная установа былога Вялікага княства Літоўскага. Пашырэнне асветы на тэрыторыю Беларусі і Літвы. Праблема народнай культуры ў дзейнасці Віленскага ўніверсітэта. Публікацыі даследаванняў па беларускай народнай культуры ў перыядычных выданнях. Узрастанне цікавасці да Беларусі і яе духоўнай культуры польскіх і рускіх навуковых колаў і грамадскасці пасля паўстання 1830-1831 гг. А.Міцкевіч пра беларускі фальклор, мову, яе гістарычную ролю ў Вялікім княстве Літоўскім.

### Тэма 11
### Навуковыя школы і кірункі ў фалькларыстыцы

Міфалагічная школа ў краінах Еўропы: Германія (А. Кун, В. Шварц. В. Манхарт), Англія (М. Мюллер, Дж. Кокс), Італія (А. де Губернацiс), Францыя (М. Брэаль), Расія (А. Афанасьеў, Ф. Буслаеў, А. Мілер). Уплыў міфалагічнай школы на вывучэнне міфалогіі, збіранне фальклору ўсходніх славян, на развіццё тэарэтычнага вывучэння міфалогіі, фальклору і літаратуры. Прадстаўнікі міфалагічнай школы ў беларускай фалькларыстыцы: П. Шпілеўскі, А. Кіркор, П. Шэйн, П. Бяссонаў і інш.

Міграцыйная школа (тэорыя запазычання, тэорыя «вандроўных сюжэтаў»). Навуковыя здабыткі Т. Бенфея як ідэйная аснова тэорыі. Тлумачэнне падабенства фальклору розных народаў пашырэннем – міграцыяй – паэтычных твораў. Прызнанне тэорыі ў эпоху



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўмацавання культурных сувязей (2-я палавіна 19 ст.). Прыхільнікі міграцынай тэорыі – А. Пыпін, У. Стасаў, В. Мілер (90-я гг.) і інш. Увядзенне ў навуковы зварот значнай колькасці тэкставага матэрыялу. Фармальна-структурныя параўнанні сюжэтаў і матываў як стрымліваючы фактар развіцця тэорыі. Ігнараванне нацыянальнай і канкрэтна-гістарычнай спецыфікі фальклору.

Антрапалагічная (этнаграфічная) школа. Фарміраванне ў сярэдзіне 19 ст. на аснове ідэй эвалюцыянізму. «Ідэнтычнасць чалавечага мыслення» ў кантэксце антрапалагічнай школы. Адыход ад філалагічнага падыходу пры аналізе першабытнай міфалогіі. Гіпотэзы пра анімізм, татэмізм, магію. Трактоўка тэорыі міфа як прадукта пазнавальнай дзейнасці людзей. Буйнейшыя прадстаўнікі антрапалагічнай школы: Дж. Фрэзер, Э.-Б. Тэйлар (Англія), В. Манхарт, Г. Узенер (Германія) і інш.

Тэорыя саманараджэння сюжэтаў ці этнаграфічная тэорыя. Пашырэнне яе ў сусветнай навуцы да пачатку 20 ст. Заснавальнікі тэорыі саманараджэння сюжэтаў – Э. Тайлор і А. Ланг. Тлумачэнне сходных з'яў у міфалогіі і фальклоры розных народаў агульнасцю псіхічных законаў і заканамернасцей духоўнай творчасці для ўсяго чалавецтва. Увядзенне ў фальклhistoryстыку паняцця «перажыткаў» для абазначэння імі элементаў «першабытнай культуры». Тэндэнцыя да архаізацыі фальклору. «Тэорыя саманараджэння сюжэтаў» як адно з найвышэйшых дасягненняў фалькларыстыкі 19 ст.

Гістарычная школа як адзін з найбольш уплывовых кірункаў у рускай фалькларыстыцы канца 19 – пачатку 20 ст. Тлумачэнне генезісу і семантыкі вусна-паэтычных твораў гістарычнымі рэаліямі. Вывучэнне помнікаў стражытнарускай пісьменнасці, былін, гістарычных песень, стварэнне гістарычнай геаграфіі рускага этнасу. Праблема "Фальклор і рэчаіснасць" як цэнтральная праблема ў разуменні мастацкай сутнасці фальклору, спецыфікі і лёсу яго асобных жанраў. Розныя погляды на праблему суадносін фальклору і гісторыі: У. Проп, Дз. Ліхачоў, Б. Пуцілаў, Б. Рыбакоў і інш.

Структуралізм як самая ўплывовая ідэйная плынь у гуманітарыстыцы 20 ст. Узнікненне структуралізма пад уплывам лінгвістыкі, семіётыкі, логікі, этналогіі. К. Леві-Строс – заснавальнік структуралізму, этнограф, сацыёлаг, культуролаг, даследчык міфалогіі і фальклору. Рэлятывісцкія трактоўкі К. Леві-Стросам культур архаічных ці традыцыйных грамадстваў. Вывучэнне славеснага мастацтва як знакавай сістэмы, элементы якой здольны да інтэграцыі і трансфармацыі. Паняцце «бінарных апазіцый». Даследаванні М. Бахціна, У. Пропа («Морфология сказки», 1928). Працы Ю. Лотмана, Е. Меляцінскага, У. Тапарова, Б. Успенскага і інш.

**Тэма 12**

**Збіранне і вывучэнне беларускага фальклору**

**беларускімі і польскімі дзеячамі культуры ў сярэдзіне 19 ст.**

Роля даследчыкаў-ураджэнцаў Беларусі ў фарміраванні беларускай фалькларыстыкі як самастойнай навуковай дысцыпліны. З. Даленга-Хадакоўскі – піянер славяназнаўства, збіральнік і даследчык беларускага, рускага, украінскага, польскага фальклору. Праграма комплекснага вывучэння культуры славян. Значэнне міфалогіі ў даследаванні традыцыйнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры славян. Я. Баршчэўскі – аўтар твора «Шляхціц Завальня або Беларусь у яе фантастычных казках і апавяданнях» (1853). Я. Чачот і яго выданне беларускіх народных песень «Вясковыя песні з-над Нёмана і Дзвіны» (1837-46). А. Рыпінскі. Фальклорны матэрыял у яго працы «Беларусь» (1840). Я.Тышкевіч – краязнаўца, археолаг, грамадскі дзеяч, даследчык народнай культуры. Вусна-паэтычныя творы ў яго працы «Апісанне Барысаўскага павета» (1847). «Народныя песні пінскага люду» Р. Зянькевіча (1851). Характар публікацый гэтага перыяду: літаратурная пераапрацоўка, пераклад на польскую або рускую мовы. Белетрызаваныя нарысы як асноўная форма фалькларыстычных даследаванняў. П. Шпілеўскі – публіцыст, даследчык міфалогіі і фальклору. Працы П. Шпілеўскага: «Беларускія паданні» (1846-1852), «Падарожжа па Палессі і беларускім краі» (1853-1855).

**Тэма 13**

**Навукова-арганізацыйная дзейнасць РГТ.**
**Фальклорна-этнаграфічныя зборнікі**
**2-й палавіны 19 - пачатку 20 ст.**

Сацыяльныя ўмовы развіцця беларускай фалькларыстыкі 1860-х гадоў. Навуковая дзейнасць Рускага геаграфічнага таварыства: пачатак прафесійнага фальклорна-этнаграфічнага даследавання Беларусі. Праграма для збору этнаграфічна-фальклорных матэрыялаў (1847). Стварэнне ў 1866 г. Паўночна-Заходняга аддзела РГТ. Мэтанакіраваны характар заняткаў па фалькларыстыцы і этнаграфіі. З'яўленне фалькларыстычных зборнікаў, якія змяшчалі розныя віды і жанры народнай творчасці. Фарміраванне навуковага паняцця каляндарна-абрадавага фальклору. Разгортванне сістэматычнай працы па зборы фальклору і этнаграфічных матэрыялаў на падставе спецыяльнай праграмы («Просьбы») П.Шэйна (1867, шмат разоў перавыдавалася). «Беларускія народныя песні» (1873) і «Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю» (т. 1—3, 1887—1902) П. Шэйна.

І. Насовіч – фалькларыст і лінгвіст. «Зборнік беларускіх прыказак» (1867) і «Беларускія песні» (1873) І.Насовіча. П. Бяссонаў – славяназнаўца і фалькларыст. "Беларускія песні" (1871) П. Бяссонава. «Беларускае вяселле і вясельныя песні» (1888) і «Песні пінчукоў» (1895) М. Доўнар-Запольскага. «Смаленскі этнаграфічны зборнік» У. Дабравольскага (ч. 1-4, 1891-1903). «Простанародныя прыкметы і павер'і...» (1897), «Нячысцікі...» (1907) і «Беларускія песні-частушкі» (1911) М. Нікіфароўскага. «Люд беларускі» М.Федароўскага (т. 1-8, 1881-1997). «Матэрыялы ддя вывучэння творчасці і побыту беларусаў» Я. Ляцкага (1898).

Е. Раманаў – аўтар фундаментальнага шматтомнага выдання па фальклору «Беларускі зборнік» (вып. 1—9, 1885—1912). Значэнне дзейнасці Е. Раманава для вывучэння культуры і гісторыі беларускага народа. Зборнік А. Сержпутоўскага «Казкі і апавяданні беларусаў-палешукоў» (1911). Інфарматары-казачнікі А. Сержпутоўскага. Я. Карскі – заснавальнік беларускага мовазнаўства. Даследаванне жанраў беларускага фальклору ў фундаментальнай працы Я. Карскага «Беларусы» (Т. 3, вып. 1, 1916).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 14
## Развіццё фалькларыстыкі ў савецкі час

Значэнне дзейнасці шматгаліновай навукова-даследчай установы БССР – Інстытута беларускай культуры. Росквіт савецкага краязнаўства ў 1920-я гг. Стварэнне ў 1924 г. пры Інбелкульце Цэнтральнага бюро краязнаўства, у 1927 г. – фальклорнай камісіі пры кафедры этнаграфіі Беларусі. Выданняў гэтага часу: «Казкі і апавяданні беларусаў з Слуцкага павета» (1926) і «Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў» (1930) А. Сержпутоўскага, «Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны» А. Шлюбскага (ч. 1-2, 1927-28), «Народныя песні з мелодыямі» М. Гарэцкага і А. Ягорава (1928). Стварэнне ў 1929 г. Акадэміі навук Беларусі і сектара этнаграфіі і фальклору пры Інстытуце гісторыі. Яго вялікая роля ў развіцці беларускай фалькларыстыкі. Тэарэтычныя даследаванні М. Нікольскага «Міфалогія і абрадавасць валачобных песень» (1931) і «Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераваннях беларускага сялянства» (1933). Выданне Р. Шырмы «Беларускія народныя песні» (1929). Знішчэнне фальклорнага архіва АН Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Савецкія ідэалагічныя ўстаноўкі ў працах па беларускай фалькларыстыцы 1930-х гг. Псеўданародныя творы ў фалькларыстычных зборніках 1930-1960-х гг. Звужэнне метадалагічнай базы навукі: класавы, сацыялагічны метад у фалькларыстыцы. Вяртанне навукі да разнастайнасці метадалагічных канцэпцый у 1950-1980-я гг.

Публікацыя першых навучальных дапаможнікаў і падручнікаў па фальклору для ВНУ. Шматтомнае выданне вусна-паэтычных твораў у серыі «Беларуская народная творчасць» (БНТ). Рэгіянальныя зборнікі. Распрацоўка праблемы ўзаемасувязі літаратуры і фальклору. Даследаванні этнамузыказнаўцаў: В. Ялатава, З. Мажэйка, І. Назінай. Публікацыя рэгіянальных фальклорных зборнікаў. Навуковыя працы па гісторыі беларускай фалькларыстыкі У. Васілевіча, Г. Кахановскага, А. Ліса, Л. Малаш, Г. Пятроўскай, А. Фядосіка, І. Цішчанкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНАЯ-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*

1. *Беларуская* фалькларыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гадах XIX – пачатку XX ст. / Аўт. Г. А. Пятроўская, І. К. Цішчанка, У. А. Васілевіч і інш. Пад рэд А. С. Фядосіка. – Мн.: Навука і тэхніка, 1989. – 332 с.
2. *Беларускі* фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г.П.Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Бел. энцыкл., 2005–2006.
3. *Беларускі* фальклор: жанры, віды, паэтыка: у 6 кн. / рэдкал.: А.С.Фядосік (гал. рэд.) [і інш.], АН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мн.: Бел. навука, 2001–2006. – Кн. 1: Каляндарна-абрадавая паэзія / А.С.Ліс [і інш.]. – 2001. – 515 с.; Кн. 3: Пазаабрадавая паэзія / А.І.Гурскі, Г.А.Пятроўская, Л.М.Салавей. – 2002. – 563 с.
4. *Беларусы*: у 12 т. / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Бел. навука, 1995. – Т. 3: Гісторыя этналагічнага вучэння / В. К. Бандарчык [і інш.]. — 1999.— 365 с. – Т. 7: Вусная паэтычная творчасць / НАНБ; Г.А.Барташэвіч, Т.В.Валодзіна, А.І.Гурскі [і інш.]; рэдкал.: В.М.Бялявіна, М.Ф.Піліпенка, У.І.Чаквін [і інш.]. – 2004. – 586 с.
5. *Васілевіч*, У. А. Збіральнікі. / У. А. Васілевіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991. – 189 с.
6. *Восточно-славянский* фольклор: словарь научной и народной терминологии / редкол.: К.П.Кабашников (отв. ред.) [и др.]. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 478 с.
7. *Казакова*, І.В. Беларускі фальклор: вучэб. дапам. / І.В.Казакова. – Мн.: Выд. цэнтр БДУ, 2007. – 309 с.
8. *Каханоўскі*, Г.А. Беларуская фалькларыстыка : эпоха феадалізму / Г.А.Каханоўскі, Л.А.Малаш, К.А.Цвірка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 228 с.
9. *Цішчанка*, І. К. Да народных вытокаў: Збіранне і вывучэнне беларускага фальклору ў 50-60-я гады XIX ст. / І. К.Цішчанка. – Мн.: Навука і тэхніка, 1986. – 248 с.
10. *Фядосік*, А. С. Беларуская савецкая фалькларыстыка / А.С.Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 145 с.
11. *Швед*, І. А. Уводзіны ў фалькларыстыку : вучэбна-метадычны дапаможнік : у 2 ч. / І. А. Швед ; Брэсцкі дзярж. ун-т імя А. С Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2009–2010.

*Дадатковая*

1. *Беларускія* народныя песні. Са зборнікаў П. Шэйна. Склад. К. Кабашнікаў. – Мн. : Дзяржвыд. БССР, 1962. – 429 с.
2. *Богданович,* А. Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Этнографический очерк / А. Е. Богданович. – Гродна: Губ типография, 1895. – 186 с.
3. *Гілевіч*, Н. С. З клопатам пра песні народа / Н. С. Гілевіч. – Мн. : Выд. БДУ, 1970. – 160 с.
4. *Гулак*, А.А. Пётр Аляксеевіч Бяссонаў: славяназнаўца і фалькларыст / А.А. Гулак. – Мінск : Паркус плюс, 2008. – 110 с.
5. *Живописная* Россия: Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. значении: Литов. и Белорус. Полесье: Репринт. воспроизведение изд. 1882 г. – Мінск : БелЭн, 1993. – 550 с.
6. *Земцовский*, И.И. Искатели песен / И. И. Земцовский. – Л. : Музыка, 1967. – 110 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. *Карскі*, Я.Ф. Беларусы / Яўхім Карскі. – Мінск : МГА "Бел. кнігазбор", 2001. – 637 с. (Беларускі кнігазбор. Серыя 2, Гісторыка-літаратурныя помнікі).

8. *Каханоўскі*, Г.А., Каханоўскі, А.Г.: Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч / Г.А.Каханоўскі, А. Г.Каханоўскі. – Мінск.: Навука і тэхніка, 1992. – 63 с. (Нашы славутыя землякі).

9. *Пятроўская*, Г. А. Пачынальнік беларускага народазнаўства М.Я. Нікіфароўскі / Г.А. Пятроўская. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 72 с.

10. *Романов*, Е.Р. З гісторыка-археалагічнай спадчыны : выбраныя творы / Е.Р.Раманаў. – Магілёў : МДУ, 2006. – 237 с.

11. *Рыгор* Шырма / аўт.-уклад. В. Д. Ліцвінка. – Мінск : Беларусь, 1990. – 64 с.

12. *Саламевіч*, І. У. Міхал Федароўскі / Янка Саламевіч. – Мн. : Выш. шк., 1972. – 46 с.

13. *Скідан*, В. І. Бяссонаў і Беларусь. Пошукі і знаходкі / Васіль Скідан. – Мн. : Звезды Гор, 2008. – 90 с.

14. *Фальклор* у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў / [уклад., сістэмат. тэкстаў і камент. В.І. Скідана, А.М. Хрушчовай. – Мінск : Бел. навука, 1997. – 342 с. – (Беларуская народная творчасць).

15. *Федароўскі*, М. Люд беларускі. Вяселле. / М. Федароўскі / уклад., прадм. і пер. з польскай мовы І.У. Саламевіча. – Мінск : Полымя, 1991. – 142 с.

16. *Фядосік*, А. С. Ілюзорнасць і сапраўднасць: «Белыя плямы» ў гісторыі фалькларыстыкі 20–30-х гг. / А.С. Фядосік. – Мінск : 1991. – 77 с.

17. *Г.І. Цітовіч* ва успамінах сучаснікаў : Зборнік / Музыч. тав-ва БССР. – Мінск : 1990. – 63 с. – (Выдатныя дзеячы беларускай музычнай культуры).

18. *Цыхун*, А. П. Акадэмік з вёскі Лаша Я.Ф.Карскі : Краязн.-біягр. нарыс / А.П.Цыхун. – Гродна, 1992. – 73 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ